**“Звоніць сэрца жарам”** /да 130-годдзя з дня нараджэння Алеся Гурло/: рэтрапогляд *(для вучняў сяр. і ст. шк. узр.)*

***Слайд 2*** Алесь Гурло - беларускі паэт, празаік, перакладчык, лінгвіст, літаратуразнаўца.

***Слайд 3*** Алесь Гурло (Аляксандр Кандратавіч Гурло) нарадзіўся (19 (31) студзеня 1892 г. у шматдзетнай сялянскай сям'і ў мястэчку Капыль Слуцкага павета Мінскай губерніі (цяпер Мінская вобласць). Бацька хоць і меў званне ветэрынарнага фельчара, але на дзяржаўнай службе не быў, займаўся земляробствам.

Жыццё было нялёгкім і прынесла шмат выпрабаванняў. З маленства давялося пастушкоўствам зарабляць на хлеб і быць парабкам.

Лёс не шкадаваў яго сям'ю і самога паэта. Смерць забірала малых дзяцей – яны памiралi ад спадчыннай хваробы — сухотаў, у маладым веку звяла ў магілу маці. Затым раптоўна памёр бацька. З усёй сям’і засталіся толькі Алесь і сястра Настасся.

***Слайд 4*** Як і ўсе сялянскія дзеці ў той час Алесь Гурло вучыўся спачатку па хатах у "дарэктара", а ў 16 год скончыў Капыльскае 4-класнае вучылішча. Працаваў чорнарабочым на лесапільні, зарабляў падзённай работай.

***Слайд 5*** Нялёгка яму было адважыцца пакінуць Капыль і падацца на пошукі працы і заробкаў. У 1911 г. ён прыехаў у Пецярбург, дзе з дапамогай Цішкі Гартнага ўладкаваўся на работу на ліцейны завод «Вулкан». Цішка Гартны - беларускі пісьменнік, паэт і перакладчык, грамадскі і дзяржаўны дзеяч, акадэмік АН БССР (1928), таксама быў родам з мястэчка Капыль. Ён скончыў двухкласную школу ў Капылі і працаваў рамеснікам-гарбаром. Некаторы час сам працаваў на заводзе “Вулкан”.

***Слайд 6*** Неўзабаве Алеся Гурло прызвалі ў царскую армію. Ён служыў на Балтыйскім флоце — перш матросам на крэйсеры "Богатырь", пазней, пасля заканчэння школы унтэр-афіцэраў у 1915 г., трапіў на эскадронны мінаносец "Забияка".

Алесю Гурло давялося зведаць жахі Першай сусветнай вайны. Ледзь не загінуў каля Данцыга, дзе эсмінец падарваўся на міне. Пасля былі цяжкія баі ў Рыжскай затоцы і каля вострава Эзэль. Ваяваў ён датуль, пакуль не атрымаў цяжкае раненне.

***Слайд 7*** Далей час уцягнуў Алеся Гурло ў крывавы вір Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый у Расіі. Нават прымаў удзел у штурме Зімняга палаца. У 1919 г., падчас Грамадзянскай вайны ў Расіі, быў цяжка паранены і камісаваны з войска як інвалід. З 1919 г. па 1920 г. працаваў у Ніжнегародскім порце.

***Слайд 8*** У 1921г. ён вярнуўся на Беларусь, жыў у Мінску. Працаваў у Наркамаце асветы БССР. У 1922-1923гг. - у газеце «Савецкая Беларусь».

У 1920-я гг. Алесь Гурло працаваў таксама ў тэрміналагічнай камісіі Інбелкульта і займаўся ў аспірантуры. Браў удзел у стварэнні тэрміналагічных слоўнікаў, напрыклад, падрыхтаваў і выдаў слоўнік «Тэхнічная тэрміналогія» (вып. 1. Мн., 1932), рыхтаваў слоўнік краўцоўскай мовы мястэчка Капыль і краёвы слоўнік Капыльшчыны (матэрыялы загінулі падчас 2-й сусветнай вайны).

У 1929-1930 гг. - навуковы супрацоўнік Інстытута мовы БелАН.

***Слайд 9*** Літаратурны дэбют Алеся Гурло адбыўся ў 1907 г. у газеце «Наша ніва», дзе быў надрукаваны яго верш "Маці Беларусь". У 1912 г. напісаў сямейна-бытавую драму «Любоў усё змагае».

У цэлым плённай была творчасць Алеся Гурло ў 20-я гады. Пабачылі свет зборнікі паэзіі «Барвёнак» (1924), «Спатканні» (1925), «Сузор'і» (1926), «Зорнасць» (1927), «Межы» (1929). А вось наступнае дзесяцігоддзе не прынесла яму прыкметных творчых удач. Наадварот, сталінская ідэалогія калечыла тагачасную паэзію, бо вымагала гучных услаўляльных прамоў, пафаснай ідэалізацыі рэчаіснасці, прымітыўна-простых радкоў і даступных вобразаў.

***Слайд 10*** Алесь Гурло быў членам літаб'яднанняў «Маладняк», «Полымя», «Пробліск». Член Саюза пісьменнікаў СССР з 1934г.

Не чакаў Алесь Гурло, каго называлі "матросам рэвалюцыі", што ў 30-я гады яму прыйдзецца слухаць абвінавачванні ў контррэвалюцыйнай і нацыянал-фашысцкай дзейнасці. Сталінская ўлада распачала паляванне на "нацдэмаў", сфабрыкавала справу супраць беларускай творчай і навуковай інтэлігенцыі. Дзесяткі чалавек былі нібыта прыналежныя да падпольнай арганізацыі "Саюз вызвалення Беларусі". Ідэйным цэнтрам "нацдэмаўскай контррэвалюцыі" хацелі абвясціць Янку Купалу — і беларускі пясняр зрабіў спробу самагубства.

Сярод удзельнікаў міфічнага "Саюза вызвалення..." 25.07.1930 г. арыштавалі і Алеся Гурло. 10.04.1931 г. ён быў асуджаны на пяць гадоў высылкі ў Самару, аднак быў вызвалены з-за кратаў з-за цяжкай хваробы. Выйсці на волю са сталінскай пасткі ўдавалася нямногім. Так у адну толькі ноч з 29 на 30 кастрычніка 1937 г. («Ноч расстраляных паэтаў» або «Чорную ноч») былі расстраляны і пахаваны ва ўрочышчы Курапаты 132 прадстаўнікі беларускай літаратуры, дзеячы культуры, навукі і мастацтва.

Алесь Гурло перажыў сваіх расстраляных калег (*на фота*) толькі на некалькі месяцаў і памёр 04.02.1938 г. Пахаваны на Вайсковых могілках Мінска. Рэабілітаваны 15.11.1957.

***Слайд 11*** Самая святая і райская зямля для Алеся Гурло - Беларусь і яе ўлонне.

З далёкіх і блізкіх дарог яго вабілі да сябе хваёвыя ляскі на схілах крутых пагоркаў, мурожныя паплавы.

*Мой край*

Край мой там, дзе рэчак хвалі
І плюскочуць, і плывуць,
Што далей – да новых даляў
Мяне клічуць і завуць.

Край мой там, дзе шэпчуць сосны,
Шумяць волаты-дубы…
Гэты шэпт і шум галосны
Ўсяму свету кажуць быль.

Край мой там, дзе поўны колас
За паклонам б’е паклон,
І жняі шчаслівы голас
Заглушае сэрца звон.

Край мой там, дзе каля хаты
Аж да неба ўзяўся сад;
Там, дзе хлопцы і дзяўчаты
Апяваюць згоду, лад.
Край мой там, дзе Нёман льецца
Срэбраплыннай паласой,
Там, дзе ўсе, усё смяецца,
Шчасцем хваліцца, красой!

***Слайд 12*** *Нашы птушкі*

Ў нашым краі — Беларусі —
Ёсць буслы, сарокі, гусі,
Качкі, чыбісы, саколкі,
Чаплі, совы, перапёлкі,
Каршуны, сіваваронкі,
Жаўранкі, шчыглы і слонкі,
Галкі, крумкачы, вароны,
Галубочкі нахахлёны,
Дзятлы, чыжыкі, зязюлі,
Кулікі, сяўцы, жаўнулі,
Шпакі, зяблікі, цяцеры,
Курапаткі, пер'ем шэры,
Ластаўкі, і верабейкі,
І сініцы, салавейкі,
Сойкі, пігліцы, удоды,
Што лятаюць без ахвоты.
Каля рэчак, на лужайках
Ёсць глушцы, стрыжы і чайкі,
І вядуцца на балотах
Жураўлі ў густых чаротах.
Па надворку, каля хаты,
Ходзяць куры й кураняты.
Хто сакоча, хто кудахча,
Хто па стрэхах спрытна скача,
Хто на кусціку ў садочку,
Хто на полі, хто ў лясочку,
Хто высока ў паднябессі
Моўчкі ўецца або з песняй:
Пачнуць хорам — не здзівіцца.
Ёсць дзе пець і весяліцца! 1921

Ў нашым краі - Беларусі
Качкі ёсць, буслы і гусі,
І сарокі, і саколкі,
Чаплі, совы, перапёлкі,
Каршуны, сіваваронкі,
І шчыглы, і жаваронкі,
Крумкачы, галкі, вароны,
Галубочкі нахахлёны,
Дзятлы, чыжыкі, зязюлі,
Кулікі, сяўцы, жаўнулі,
Зяблы, шпакі і цяцеры,
Курапаткі, пер'ем шэры,
Ластаўкі, і верабейкі,
І сініцы, салавейкі,
І глушцы ёсць, і удоды,
Што лятаюць без ахвоты,
Над ракамі, ля вадзіцы
Чайкі, чыбісы, пігліцы,
І вядуцца на балотах
Жураўлі ў густых чаротах.
Хто сакоча, хто кудахча,
Хто па стрэсе спрытна скача,
Хто на кусціках ў садочку,
Хто на полі, хто ў лясочку…
Ці ўлетку, ці прадвесняй
Слухаць міла іхні песні, -
Моўчкі ўецца або з песняй:
Пачнуць хорам — не здзівіцца-
Ёсць дзе пець і весяліцца…

***Слайд 13*** *«Абнімаецца вецер з бярозай...»*

Абнімаецца вецер з бярозай,
Абнімаецца, быццам каханак,
І ўцірае з вачэй яе слёзы,
Яны капаюць срэбрам на ганак.

Залаціста-ружовыя косы
Апусціла бяроза долу.
Многа думак навеяла восень -
І вясёлых і невясёлых.
Яна рада, што ў новым убранні
І што вецер больш неяк прыхільны,
А не рада, што золата ў твані
Рассыпаецца, мокне і стыне.
Ах, бяроза, бяроза-красуня!
Не сумуй па сваёй лістоце,
Бо твой сум адаб'ецца на струнах
І застыне ў маёй істоце. 1926

***Слайд 14*** *Я вольна жыць хачу*

Змагацца я прывык... Жыццё - мая стыхія,
І з ранніх дзён вядома мне турма,
І дні вядомы мне, няволяю ліхія,
А шчасце - вораг мой: яго ў мяне няма!
За ім ганяюсь я, лаўлю яго вачамі,
І насустрэч я мыслямі лячу,
Не сплю, чакаючы, я цэлымі начамі,
Бо, - даўні раб, - я вольна жыць хачу!
Я прабаваў усё: ахвяры і маленні;
Не чуў іх Бог, не чуў і чалавек:
Заместа хлебных луст мне кідалі каменні...
Я кляў сябе і свой злашчасны век.
Бурліла кроў мая, мацнелі мае сілы,
Пуцінай барацьбы я шчасце стаў шукаць;
І што ж перада мной? Вялікі рад магілаў...
І мушу я між іх, бы ўкопаны, стаяць.
Наўкол ліецца кроў, наўкол людскія цені...
Як бы сшалелы, я не знаю, што рабіць.
А сонца кідае крывавыя праменні:
Куды ісці? Я вольна хачу жыць!.. 1915

***Слайд 15*** Алесь Гурло першым раскрыў беларускаму чытачу дзівосную экзотыку і паэзію марскіх краявідаў. Мора паўстае ў сваёй велічы і неўтаймоўнасці:

То ціха яно, чуць дыша, чуць б'ецца,
І сонца праменні цалуюць яго;
То, ўзняўшыся валам, нясецца, нясецца,
І белая пена блішчыць, як агонь.
Ракоча і стогне удар за ударам
І лезе на хвалю хваль новых града.

У вершах "Шторм", "Вечар на моры", "Мора на ўсходзе сонца", "Русалкі" паэт натхнёна паэтызуе гоман хваль, крыкі чаек, залатыя агні маякоў, бурлівасць вады, бяскрайнюю іскрыстую шыр марскіх даляглядаў. Ён паказвае мора ў

розных станах і праявах — грознае, ціха-вечаровае, разбуджанае ранішнім усходам сонца, таямніча-казачнае. Яно — вобраз непакоры і свабоды.

***Слайд 16*** Творы Алеся Гурло:

Гурло, А. Выбраныя творы Алесь Гурло. - Мінск, 1950;

Гурло, А. Вершы / Алесь Гурло; уклад. С. Александровіч.- Мінск: Мастацкая літаратура, 1972.- 174с.- (Бібліятэка беларуская паэзіі).

Гурло, А. Нашы птушкі: вершы / Алесь Гурло.- Мінск: Мастацкая літаратура, 1974.- 14с.

Гурло, А. [Вершы] / Алесь Гурло // Анталогія беларускай паэзіі: у 3 т. Т.1. / уклад. А. Мальдзіс і інш. – Мінск, 1993. – С.505-507.

Гурло, А. Нашы птушкі: верш / Алесь Гурло // Вяснянка: вершы, апавяданні, казкі беларускіх пісьменнікаў / склад. У Ліпскі. – Мінск,1991. –С.177-178.

Гурло, А. Мой край: верш / Алесь Гурло // Зборнік для чытання ў IV класе. Ч.1. / склад. Н.У. Антонава. – Мінск, 2020. – С.50.

Гурло, А. [Вершы ] / Алесь Гурло // Мелодыі роднай зямлі: Капыльшчына літаратурная / уклад. В. Шніп.- Мінск, 2021.

Гурло, А. Вершы. Апавяданні / Алесь Гурло // На ўсходзе сонца: творы беларускіх пісьменнікаў пачатку XX стагоддзя / уклад. У.М. Казбярук. – Мінск, 1990. – С.261-266.

Гурло, А. . [Вершы ] / Алесь Гурло // Паэзія першай паловы XX стагоддзя: міжваенны перыяд / уклад. А.І. Шамякіна.- Мінск, 2017.

Гурло, А. [Апавяданне. Вершы] / Алесь Гурло // Першацвет Адраджэння: вучэбны дапам па бел. літ. для ст. кл. сяр. шк. / склад. М.А. Федасеенка і інш. – Мінск, 1995.- С.246-251.

Гурло, А. [Вершы] / Алесь Гурло // Роднай старонцы: зборнік твораў канца XУIII - пачатку XX ст. / склад. Т.Ф. Рослік. - Мінск, 2012. – С.245-246.

Гурло, А. Нёман: верш / Алесь Гурло // Слова аб роднай прыродзе / уклад. Грабчыкаў,- Мінск, 1989.-С.29-30.

Гурло, А. [Вершы] / Алесь Гурло // Спадчына: зборнік / уклад. У.М. Казбярук. – Мінск, 1999. – С.98-100.

Гурло, А. Мой край. Нашы птушкі: вершы / Алесь Гурло // Хрэстаматыя па беларускай дзіцячай літаратуры: склад.. М.Ф. Шалкоўская. – Мінск, 1989.-С.134-135.

Гурло, А. [Вершы] / Алесь Гурло // Шляхі: Беларуская паэзія 20-30-х гадоў / склад. Л.С. Курбека. – Мінск, 1992.-С.66-81.

Гурло, А. Нёман: верш / Алесь Гурло // Роднае слова.- 2003.- №9.- С.74.

***Слайд 17*** Дзякуй за ўвагу!

Спіс выкарыстанай літаратуры:


1. Алесь Гурло // Беларускія пісьменнікі (1917-1990): даведнік / склад. А.К. Гардзіцкі.- Мінск, 1994.- С.158.
2. Бельскі, А.І. "Плешча мора вечнай воляй..." А.І. Бельскі // Беларуская літаратура XX стагоддзя: гісторыя і сучаснасць / А.І. Бельскі. - Мінск, 2005. - С.29-34.
3. Звонак, А. Неспакойныя сэрцы: творчыя партрэт бел. паэтаў, пісьменнікаў, дзеячоў культуры паслякастрычніцкага пакалення / Алесь Звонак. - Мн. : Мастацкая літаратура, 1973. - 167с.
4. Карніловіч, Э.А. Імёны з небыцця / Э.А. Карніловіч. - Мінск: Беларусь, 2003. - 315с.
5. Мішчанчук, М.І. Беларуская савецкая паэзія 20-х гадоў: вучэбны дапаможнік для філ. фак. пед. ін-таў / М.І. Мішчанчук. - Мінск: Вышэйшая школа, 1988.- 191с.
6. Хведаровіч, М. Памятныя сустрэчы: нарысы пра бел. пісьменнікаў / Мікола Хведаровіч. - Мінск : Народная асвета, 1977.- 207с.
7. Андруковіч, А. “Плешча мора вечнай воляй…” / А. Андруковіч // Роднае слова.- 2002.-№1.-С.13-17.
8. Асаёнак, В.Я. 31 студзеня — 125 гадоў з дня нараджэння А. Гурло (1892—1938), акадэміка НАН Беларусі, грамадска-палітычнага дзеяча: [бібліяграфічны спіс] / В.Я. Асаёнак, Г.В. Брага, Н.А. Шашэнька // Новыя кнігі: па старонках беларускага друку. - 2016. — № 10. — С. 23—25. (дадатак).

Пры падрыхтоўцы выкарыстаны звесткі з адкрытых крыніц Інтэрнету.

https://commons.m.wikimedia.org/wiki/Category:Historical_images_of_Kapyl#/media/

https://knihi.com/Ales_Hurlo/

https://karotkizmest.by/биографии/алесь-гурло.html

http://kopyl-region.narod.ru/Izvestnye_kopylyane/Gurlo/Gurlo.html


Падрыхтавала бібліятэкар СШ№11 г.Ліды Т.Зенюкевіч